Роднае слова. 2015. № 10. С. 77-81.

# АСОБА ШМАТГРАННАГА ТАЛЕНТУ.

## Да 130 годдзя з дня нараджэння Алеся Бурбіса.

Як гэта ні цяжка ўсведамляць, мала хто не толькі з маладых жыхароў нашай краіны, але нават з людзей сярэдняга і сталага ўзросту, адкажа на пытанне: "Хто такі Алесь Бурбіс?".

Дарэчы. няма адзінай думкі па гэтаму пытанню і ў аўтараў энцыклапедычных і іншых артыкулаў аб гэтай асобе ў часопісах, газетах, зборніках і асобных кнігах.

Пяты том "Краткой энциклопедии Белорусской ССР" (Мн., 1982) адзначае "Александр Лаврентьевич Бурбис – бел. обществ. и театр. деятель".

Перад намі артыкул вядомага беларускага гісторыка Міхася Біча "Алесь Бурбіс" у другім томе "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" (Мн,, 1994). Мы чытаем "Бурбіс Алесь …, дзеяч беларускага нацыянальна-вызваленчага адраджэння".

Рэдкалегія навуковага, навукова-папулярнага, грамадска-палітычнага і літаратурна-мастацкага часопіса "ARCHE Пачатак" (2011, № 11, снежань) прадстаўляе Аляксандра Бурбіса як "беларускага палітыка, навукоўца і грамадскага дзеяча".

На мой погляд, самы поўны адказ на пастаўленае мной пытанне даў беларускі журналіст і гісторык, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі Анатоль Мяснікоў:

"Алесь Бурбіс - выдатны дзеяч беларускага нацыянальна-вызваленчага руху.

Шмат кім быў ён. Адным з заснавальнікаў Беларускай сацыялістычнай Грамады і сярод пачынальнікаў беларускага прафесійнага тэатра, супрацоўнікам Народнага банка і Народнага камісарыята земляробства, акцёрам і чытальнікам, журналістам і гісторыкам, намеснікам народнага камісара замежных спраў БССР і адным з арганізатараў таварыства Чырвонага Крыжа Беларусі, даследчыкам эканамічнай геаграфіі і этнаграфіі нашай рэспублікі…" [1, с.11]

Радзіма Алеся Бурбіса - горад Вільня. Тут 20 кастрычніка 1885 года пачаўся яго жыццёвы шлях. Менавіта ў гэтым горадзе ён вучыўся ў гімназіі. Яшчэ ў 1902 годзе. калі Алесь быў вучнем Віленскай гімназіі, ён стаў адным з заснавальнікаў мясцовай арганізацыі Грамады.

Даследчыкі жыцця і дзейнасці А.Л,Бурбіса правамерна акцэнтуюць увагу на тое, што ён быў адным з заснавальнікаў Беларускай

Сацыялістычнай Грамады (БСГ). Гэта была нацыянальная партыя леванародніцкага кірунку, якая была ўтворана зімой 1902-1903 года пад назвай "Беларуская рэвалюцыйная грамада"(БРГ) на аснове нацыянальна-культурных гурткоў беларускай вучнёўчкай і студэнцкай моладзі. якія існавалі ў Мінску, Пецярбургу і Вільні. Стваральнікам і кіраўнікамі БСГ сталі браты І. і А.Луцкевічы, А.Пашкевіч (Цётка). А.Бурбіс, К.Кастравіцкі (Кастусь Каганец). В.Іваноўскі, Ф.Умястоўскі і іншыя. Яны паходзілі ў большасці з дробнамаянтковай шляхты, фактычна ж належалі да разначыннай інтэлігенцыі.

На 1-м (1903) і 2-м з'ездах БСГ Алесь Бурбіс, нягледзячы на свой вельмі маладыў ўзрост, быў выбраны членам яе ЦК, што сведчыла аб аўтарытэце, якім карыстаўся гэты юнак

Шэраг даследчыкаў лічыць Алеся Лаўрэнавіча адным з першых і нават першым гісторыкаў БСГ. Разам з тым аўтарытэтныя беларускія вучоныя-гісторыкі М.В.Біч і С.С.Рудовіч звяртаюць увагу на наступнае:

"Паводле ўспамінаў А.Бурбіса ("Беларуская сацыялістычная Грамада ў першым перыядзе яе працы (1903-1907)" (1924), БРГ на сваім 1-і з'ездзе перайменавалася ў БСГ. Такі вывад шырока распаўсюдзіўся ў гіст. літаратуры. Аднак ва ўспамінах А.Луцкевіча ""За дваццаць пяць гадоў", 1928) і Я.Хлябцэвіча ("Цётка", 1924) сцвярджаецца, што гэта адбылося на 2-м з'ездзе Грамады ў пачатку 1906 года. Першая праграма, а таксама ўсе лістоўкі БСГ, выдадзеныя ў 1905, пацвярджаюць сказанае Бурбісам. Але лістоўкі "Таварышы!", "Брацця мужыкі", выдадзеныя ў 1904. г.зн. пасля 1-га з'езда, мелі подпіс "Беларуская рэвалюцыйная грамада". Гэтыя супярэчнасці ў пытанні аб перайменаванні БРГ у гіст. літаратуры пакуль не высветлены. Да таго ж ва ўспамінах Бурбіса пераблытаны праграмныя рашэнні 1-га і 2-га з'ездаў БСГ па нац. пытанні" [2, с.410]

Адна з важных вех у жыцці Алеся Лаўрэвавіча - кіраўніцтва "Мейшагольскай рэспублікай". Калі і дзе яна была ?

Справа ў тым, што многія чытачы ніколі не чулі аб такім дзяржаўным утварэнні . У час рэвалюцыі 1905-1907 гадоў, а дакладней ў лістападзе 1905 года ў Мейшагольскай воласці Віленскага павета пад кіраўніцтвам 20-гадовага Алеся Бурбіса старая ўлада фактычна была скінута і ўзнікла "Мейшагольская рэспубліка".

У сувязі з гэтым нельга не згадзіцца з думкай вядомага беларускага літаратуразнаўцы Алеся Марцінкевіча:

"Нікольki не памыляліся тыя, хто пагаворваў аб магчымым утварэнні сваёй, мейшагольскай рэспублікі. Ідэя гэта авходзіла ад самога Бурбіса. І ўзнікла яна невыпадкова…

Бурбіс хутка пераканаўся, як шмат у мястэчку незадаволеных мясцовым начальствам, таму і вырашыў узяць у воласці кіраўніцтва ў свае рукі. Прапанову горача падтрымалі яго паплечнікі.. І хоць у час сходаў яны заклікалі звергнуць уладу шляхам узброенага паўстання, тут усё вырашылі. Можна сказаць, мірна і памяркоўна. Валасному старшыні, убачыўшы. Што ў час чарговага пасяджэння ніхто яго не падтрымлівае. Нічога не заставалася, як добраахвотна адмовіцца ад сваіх паўнамоцтваў. Тады і была прапанавана на пасаду старшыні кандыдатура Бурбіса . Новы старшыня адразу абвясціў “Мейшагольскую рэспубліку”.

У час свойго кіравання Бурбіс праявіў вялікі дэмакратызм. Любое больш-менш важнае пытанне вырашалася супольна. На сходах, а яны, паколькі становішча таго вымагала, праводзіліся часта, нават па некалькі на тыдзень, кожны мог выказаць думку. у асноўным гэта тычылася палітычнага жыцця, сацыяльнага становішча. І так працягвалася з лістапада па снежань 1905 года, калі існавала “рэспубліка” [3, с.222].

Калі пачалося наступленне рэакцыі, Бурбіс вымушаны быў развітацца з “мейшагольскай рэспублікай”. Трэба было тэрмінова знікнуць, каб не трапіць у рукі ўлад. Алесь Лаўрэнавіч усведамляў, што ён апынецца ў бяспецы, калі пераедзе ў які-небудзь горад. Такім горадам стаў Мінск, таму што ў студзені 1906 года там меўся адбыцца другі з’езд Беларускай Сацыялістычнай Грамады. Менавіта, жывучы ў Мінску Бурбіс вёў агітацыю, арганізоўваў забастоўкі рабочых-сталяроў і сельскагаспадарчых рабочых Навагрудскага павета.

24 жніўня 1906 года Алесь Лаўрэнавіч быў арыштаваны ў вёсцы Дольнае тагачаснай Шчорсаўскай воласці. Пры сабе ён меў пашпарт на імя Генрыха бухавецкага. Не здагадваючыся. Хто перад імі на самой справе, улады абвінавацілі затрыманага ў вядзенні агітацыі сярод сельскагаспадарчых рабочых Навагрудскага павета.

У архіўных дакументах зафіксавана, што “Г.Бухавецкі меў пры сабе чатыры экземпляры “Манифеста ко всему российскому крестьянству”. Манифест “К армии и флоту”, лістоўку “Да ўсіх вясковых людзей” з дэвізам “Працавітая бедната ўсіх краёў, злучайся”!”, нейкую шыфраваную запіску, змест якой так і не ўстанавілі.

Пасля доўгага знаходжання пад следствпам 18 кастрычніка 1908 года Алеся Бурбіса прысудзіда два двух гадоў зняволення. Знаходжанне пад следствам у разлік не прымалі. У канцы 1909 года яго вызвалілі.

Перыяд 1907-1909 гадоў быў вельмі складаным і цяжкім, таму што ён характарызаваўся наступленнем паслярэвалюцыйнай рэакцыі. Менавіта ў гэтыя гады Алесь Бурбіс, няўрымслівая душа якога не магла жыць без

дзейнай справы, актыўна бярэцца за наладжваннее ў родным краі тэатральнай справы.

Даследчык А.Мяснікоў слушна заўважае:

“Уласна кажучы, ён быў знаёмы з ёй раней, да арышту. Яшчэ зімой 1906 года Бурбіс ажыццявіў пастаноўку п’есы М.Крапіўніцкага “Па рэвізіі”. Прэм’ера яе адбылася на хутары Пятроўшчына непадалёку ад Мінска. Тады малады пастаноўшчык уключыў у спектакль аркестр: цымбалы. ,бубен і скрыпка гучалі зладжана і прыгожа. Гледачам – сялянам і парабкам з скседніх фальваркаў падабаўся не толькі сам спектакль, але і вершы Я.купалы “Што ты спіш?...”, “Не рвіся к багатым” і “Пашкадуй мужыка”, прачытаныя Алесем Лаўрэнавічам.

На думку Алеся Марціновіча, спектакль уразіў прысутных. Па жанру гэтая п’еса – камедыя, захапляльная, з выкарыстаннем шматлікіх прыказак і прымавак. Пры перакладзе яе на беларускую мову пастаноўчкі паклапаціліся, каб вясковы глядач ўсё успрымаў так, быццам яно адбываецца ў блізкіх яму мясцінах. Асобныя імёны персанажыў, назвы населеных пунктаў замянілі беларускімі. Ды і выканаўцы імкнуліся размаўляць, улічваючы асаблівасці мясцовай гаворкі.

Разам з тым важна падкрэсліць, што вяскоўцы сустрэлі п’есу “Па рэвізіі” надзвычай добразычліва, аге гэта была выключна аматарская спроба Алеся Бурбіса.

У 1909-м ён вырашыў узяцца за справу больш сур’ёзна. Дапамагчы Бурбісу ахвотна згадзіліся Алаіза Цётка, браты Леапольд і Чэслаў Родзевічы. Праз два гады свтвораны імі Беларускі народны тэатр і хор быў ператвораны ў Віленскі беларускі музычна-драматычны гурток. А яшчэ праз год – у 1912-м – гурток уліўся ў тэатр Ігната Буйніцкага. Як вядома, гэта была першая прафесійная тэатральная група беларусаў. Бурбіс стаў у ёй рэжысёрам пастаноўшчыкам. Асабліва вялікай папулярнасцю карысталася пастаўленая ім п’еса В.Дуніна-Марцінкевіча “Залёты”. Пра тэатр і ў прыватнасці пра пастаноўкі Алеся Бурбіса шмат пісала прэса тых дзён.

Хоць шэраг даследчыкаў лічыць, што з 1915 года ён адышоў тэатральный дзейнасці і займаўся выключна палітычнай дзейнасцю, на самой справе пастаноўкі і канцэрты Алес ь Лаўрэнавіч наладжваў ажно да падзей Кастрычніка 1917 года, у асноўным пры Беларускіх бежанскіх камітэтах у Маскве і Пецярбургу” [1, с.15]

Безумоўна, Алесь Бурбіс быў таленавітым тэатральным дзеячам, арыгінальным акцёрам і рэжысёрам., адным са стваральнікаў беларускага прафесійнага тэатра. Аб гэтым сведчаць пастаноўкі ім спектакляў

“Пашыліся ў дурні” (1907) М.Крапіўніцкага, “Залёты” В.Дуніна-Марцінкевіча (1915, музычна-драматыны гурток у Вільні). Наогул. з іменем Бурбіса звязан арганізацыя драматычных гурткоў і беларускіх вечарынак у Вільні ў 1920 годзе. Сучасныя беларускія тэатразнаўцы і мастацтвазнаўцы высока ацэньваюць выкананне ім драматычных і камедыйных роляў млынара Куксы (“Пашыліся ў дурні”, Падарожнага (“У зімовы вечар” паводле Э. Ажэшкі), суддзі Сакальніцкага “(“Залёты”Ломава (“Сватання” А.Чэхава” і іншых.

Аналізуючы творчую спадчыну Аляксандра Лаўрэнавіча, мы канстатуем, што адной з яго каштоўнай прац быў артыкул пад назвай “Колькі слоў аб беларускім тэатры і хоры”, які ўбачыў свет праз 53 года пасля яго смерці – у 1975 годзе. Прывядзем некаторыя фрагменты гэтай працы:

“У 1909 року працаўнікі з “Нашай Нівы” ў Вільні пачалі спробы залажыць беларускую трупу аматараў, але гэта не ўдавалася перш-наперш затым, што былі заняты выдавецкай працай, ды. Апрач таго, гэта [му] перашкаджала недахватка грошай.

Улетку 1909 року з вастрогу быў асвабоджаны пасля 3-х гадовага сядзення А.Бурбіс, які і ўзяўся за арганізацыю тэатру й хору. Якраз у гэтым часе «Виленский Отдел Императорского Музыкального Общества» рыхтаваўся да арганізацыі этнаграфічнага вечару, у якім мелі быць прадстаўлены хоры ўсіх народаў…

Беларусы запатрабавалі, каб быў і беларускі аддзел, што выклікала здзіўленне –“што гэта за беларусы”. Дабіцца згоды на беларускі аддзел ўдалося дзякуючы дапамозе прафесара музыкальнай школы фінляндца Ратасэпа. Музыкальная школа дала памяшканне для пробаў хору (на Скапоўцы). Кіраўнік хору знайшоўся ў асобе чалавека з вышэйшай музыкальнай адукацыяй вядомага кампазітара Людаміра Міхала Рагоўскага, які хоць і паляк-мазур, але вельмі цікавіўся народнай музыкай наогул і беларускай асабліва. Ён першы, бадай, зразумеў, што ў групе беларускай народнай песні паложаны двухтановы індыйскі гукарад (гама), што адрознівае яе ад песняў іншых славянскіх народаў. Ён першы гарманізаваў мастацкія беларускія матывы сапраўды ў беларускім народным духу. Яго музыкальнае вуха першае прызнала, што С. Манюшка, якога лічаць палякам, клаў у сваю музыку. быць можа зусім несвядома, беларускія народныя матывы, бо ён сапраўды, пражыўшы цэлае сваё жыццё арганістам на Беларусі. іншых, як беларускіх, матываў не чуў. Цікава, што на яго музыку словы беларускіх паэтаў (Янкі Купалы. напр.) кладуцца зусім добра й без паправак нават…

Прыйшлося гатавацца да этнаграфічнага вечару, ня маючы ані рэпертуару. Ні людей, ні вопратак… Сабраўся пасля даложанай да гэтага працы хор на 100 чалавек. маючы пад дастаткам усе галасы. Арганізацыйная і адміністратыўная частка належыла да А.Бурбіса. кіраўніцтва музыкальнае – да Л.Рагоўскага. Да апошняга дня прыводзілі з вёсак кабет і мужыкоў (асабліва кабет, І Рагоўскі запісваў народныя песні, прысылалі й з мейсца запісаныя песні й яны гарманізаваліся Рагоўскім. Такім парадкам ствараўся рэпертуар хору.

Паміж іншым Рагоўскі напісаў музыку да слоў Янкі Купалы: “А хто там ідзе?”. Гэта песня доўгі час спявалася як беларускі гімн….

У тым часе ў Пецярбургу арганізоўваўся таксама беларускі хор, арганізацыяй якога займаўся галоўным чынам прафесар В.Іваноўскі…

Узімку 1909-1910 року ў Вільні ў Гарадской Салі адбыўся этнаграфічны вечар, на якім першы раз выступілі беларусы…Вільня горача вітала першы раз выступаючую беларускую працоўную беднату. Пасля выступіў беларускі народны балет пад загадам танцора - артыста Ігната Буйніцкага. Адзін за адным ішлі беларускія танцы: “Лявоніха”, “Мяцеліца”, “Юрка”, “Гневаш”,” Чабор”.

Танцорам прыйшлося бясконца бісаваць па запатрабаванню публікі. Трэба адзначыць і вялікі талент, і энергію Ігната Буйніцкага, ідэальна, па-мастацкі апрацаваўшага беларускія народныя танцы” [4, С.310-311]

Алесь Лаўрэнавіч па-майстэрску, вельмі эмацыянальна выступаў з дэкламацыяй вершаў такіх беларускіх паэтаў, як Я.Купала, Я.Колас, М.Багдановіч, А.Паўловіч. Засталіся яго пераклады украінскіх і беларускіх п’ес для беларускай сцэны, яго аўтарская інсцэніроўка “Хама” паводле Э.Ажэшкі.

Для будучых даследчыкаў жыцця і дзейнасці Янкі Купалы і Алеся Бурбіиса аўтар гэтых радкоў хоча рэкамендаваць тэму “Алесь Бурбіс і Янка Купала”. Без перавялічэння можна адзначыць, што знаёмства гэтых выдатных асоб, якое адбылося ўлетку 1904 года ў Мінску на адной з канспіратыўных кватэр, де праходзіла рэвалюцыйная сходка, зрабіла значны ўплыў на фарміраванне светапогляду Янкі Купалы, на фарміраванне яго рэвалюцыйна-дэмакратычных поглядаў. Ёсць пэўныя падставы для сцвярджэння, што яны пасябравалі. Мала каму вядома, што менавіта Алесь Лаўрэнавіч Бурбіс даваў Івану Дамінікавічу Луцэвічу для распаўсюджання нелегальную літаратуру. З другог боку, ён сам выкарыстоўваў вершы Я.Купалы ў агітацыйных мэтах. Пасля таго, як Алесь Бурбіс з поспехам прачытаў верш паэта “Шт о ты спіш?...” пасля спектакля ў Пятроўшчыне пад Мінскам, ён успамінаў:

“Верш гэты фактычна быў клічам да паўстання проці цара і паноў” [5, с.199].

14 снежня 1913 года Алесь Бурбіс ад імя савета старшынь Беларускага музычна-драматычнага гуртка звярнуўся ў віленскую цэнзуру па даведку. што зборнікі Я.Купалы “Жалейка” і “Шляхам жыцця” не значацца сярод забароненых. Нельза не згадзіцца з вядомым беларускім літаратуразнаўцам Г.В.Кісялёвым. што гэта сведчыць аб нязменнай цікавасці Бурбіса і гуртка да творчасці Купалы.

У аўтабіяграфічным лісце да біёграфа Я.Купалы Л.Клейнбарта ад 21 верасня 1928 года Янка Купала ўспомніў аб сваім знаёмстве з Алесем Бурбісам, з захапленем расказваў пра яго пры асабістых сустрэчах.

У рэцэнзіі на аперэту “Залёты” паводле аднайменнай камедыі В.Дуніна-Марцінкевіча Я.Купала адзначаў добрую ігру А.Бурбса ў ролі суддзі:

“Бурбіс, як заўсёды, не папусціў сябе ў крыўду і ў ролі суддзі” [6, с.219]/

Амаль шэсць гадоў ён працаваў у Віленскім таварыстве сельскай гаспадаркі. Зрэдку дасылаў допісы ў “Нашу Ніву”, друкуючы іх пад рознымі псеўданімамі, але найчасцей пад мянушкай ”Стары Піліп”. Чаму Піліп – даследчыкамі пакуль не ўстаноўлена. А вось “старому” было ўсяго 24-29 гадоў.

З 1915 года Алесь Бурбіс працаваў у Народным банку ў Маскве, а ў 1917 годзе ўзначаліў Маскоўскую арганізацыю БСГ. У 1918-м Народны Сакратарыят Беларускай Народнай Рэспублікі прызначыў Алеся Лаўрэнавіча сваім консулам у Маскве.

У пачатку 1919 года ён вітаў утварэнне ССРБ, а ў лютым таго ж года пачаў працаваць у Вышэйшым Савеце Народнай Гаспадаркі РСФСР. Праз некалькі месяцаў – у маі 1919 года Бурбісу прапанавілі перайсці ў Народны камісарыят земляробства Літоўска-Беларускай ССР.

Чым жа азнамянаваўся для Алеся Лаўрэнавіча 1920-ты год?

Ён удзельнічаў у выданні газеты “Савецкая Беларусь”, а таксама разам з Язэпам Дылам і Фёдарам Туруком падрыхтаваў дакладную запіску па гісторыі Беларусі ў Народны Камісарыят замежных спраў РСФСР. У жніўні 1920 года Алесь Бурбіс прадрыхтаваў даклад “Белоруссия и её экономическое положение» для дэлегацыі РСФСР, створанай для вядзення мірных перагавораў з Польшчай. У гэтым дакладзе была дадзена характарыстыка эканамічнага становішча і прыродна-кліматычных умоў усёй Беларусі і яе губерняў. Статыстычныя дадзеныя. Якімі аперыруе аўтар.

Тычацца пераважна 1913 года. Такім чынам, перад намі паўстае цікавая і своеасаблівая карціна передваеннай Беларусі.

У архіўнай справе гэты дакумент мае наступны падзагаловак: “Доклад комиссии по подготовке мирного договора с Польшей, Август 1920 г. Москва. Автор А.Л.Бурбис. Докладная записка на 138 л.”. Дакумент выящлены щ Архиве знешняй палитыки Расийскай Федэрацыи. Ф.54.Оп.1. Пап.6. Д.1. падрыхтваны да публикацыі доктарам гістарычных навук прафесарам БДУ У.Е.Снапкоўским і апублікаваны ў часопісе “ARCHE” (2011, № 11, снежань. С.98-128).

Калі б аўтара гэтых радкоў папрасілі раскрыць тэму “Алесь Бурбіс у 1921 годзе”. ён бы ўспомніў аб уступленні Алеся Лаўрэнавіча ў камуністычную партыю, аб прыначэнні яго ў ліпені наменікам наркома замежных спраў БССР, аб выбранні яго членам ЦВК ССРБ, аб тым. як Бурбіс стаў адным з арганізатараў таварыства Чырвонага Крыжа ССРБ.

Менавіта ў першых двух намерах (№1-2) “Вестника народного комиссариата просвещения ССРБ» быў надрукаваны артыкул А.Бурбіса “Кароткі агляд беларускага нацыянальна-рэвалюцыйнага руху”.

Аналізуючы гэту працу. Беларускі гісторык М.Біч адначаў:

“Бурбіс падкрэсліваў, што беларускі народ захаваў рысы асобнай нацыі – “сваю мову, звычаі. Свій самастойны культурны і эканамічны ўклад жыцця”. канцэпцыя Бурбіса зараз можа разглядацца як навуковая ў сваёй аснове, за выключэннем тэзіса аб “свабодна-дэмакратычным фундаменце” дзяржаўнасці і культуры Беларусі 11-16 ст. Пачатак беларускага нацыянальнага руху Б. адносіў да 1830-40-х гадоў і звязваў яго з зараджэннем беларускага пісьменства… Беларускі нацыянальны рух пачатку 20 ст, калі яго кіраўніком стала БСГ. асветлены на аснове ўласных успамінаў… Цэнтрам згуртавання нацыянальна свядомых сіл у той час стала газета “Наша ніва”…Успаміны Бурбіса, як і ўсякія іншыя, патрабуюць крытычнага падыходу і праверкі іншымі крыніцамі” [7, с.134]

Алесь Лаўрэнавіч усё жыццё вельмі шанаваў родную, беларускую мову і заўсёды выступаў у яе абарону.

У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь захоўваецца “Даклад 32-х беларусаў-камуністаў у ЦБ КП(б)Б аб шляхах будаўніцтва ўзорнай Савецкай Беларусі” ад 1 лютага 1921 года. Адначасова з дакладам у ЦБ КП(б)Б яго аўтары звярнуліся 14 студзеня 1921 года з дакладной запіскай у ЦК РКП(б), якую адвёз са сваім суправаджальным лістом на імя У.І.Леніна вядомы нацыянальны, грамадскі і палітычны дзеяч, літарататар А.Л.Бурбіс. які працаваў у Наркамземе Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі. У дакладной запісцы ў ЦК РКП(б) быў зняты раздзел па нацыянальна-

культурных праблемах, у ёй больш крытычна ацэньвалася дзейнасць кіраўніцтва Аблвыкамзаха і Літоўска-Беларускай ССР. Да дакладной запіскі прыкладзена інфармацыйная даведка аб гістарычным мінулым, палітычным і грамадскім ладзе. нацыянальна-вызваленчым руху ў Беларусі.

Ёсць сур'ёзныя падставы сцвярджаць. што Алесь Лаўрэнавіч раздзяляў думкі аўтараў даклада ў ЦБ КП(б)Б – 32-х беларусаў-камуністаў. Пагэтаму мэтазгодна прывесці некаторыя радкі з гэтага важнага архіўнага дакумента:

"…В организуемой образцовой Белорусской Социалистической Республике следует уделить внимание белорусской школе, каковая должна быть признана ударной как по соображению международного характера, о котором говорилось выше, так и в связи с настроением трудящихся масс Белоруссии в настоящее время. Должно быть обращено серьёзное внимание на издательство на белорусском языке как учебников, т ак равно и коммунистической литературы. К сожалению. до настоящего времени эт о ставилось на последний план, и белорусским трудящимся приходилось пользоваться учебниками и книгами, изданными при царизме, в оккупированных частях Белоруссии. При Советской же власти в этом направлении ничего не сделано, что ловко используется нашими врагами, указывающими на русификаторскую политику Советской власти в Белоруссии . В отношении языка следует признать белорусский язык наряду с русским. В настоящее время мы стоим перед фактом фактического признания в Белоруссиии государственным языком русского. Мы считаем, что все приказы, декреты и т.п. должны издаваться на белорусском и русском языках. Следует белорусскую газету "Савецкая Беларусь" сделать официальным органом ССРБ, организовав соответствующее издательство. Необходимо как можна обильнее снабжать белорусское крестьянство и рабочих коммунистической литературой на белорусском языке (крестьянская газета, орган профессиональных союзов, листовки, брошюры, календари и т.п.). Необходимо..чтобы ЦБ Коммунистической партии Белоруссии повело агитацию и пропаганду среди белорусских масс на белорусском языке. Если же ЦБ этого не в состоянии провести, то необходимо образование соответствующего органа…" [8, л.93-96].

Безумоўна, што А.Л.Бурбіс быў асобай шматграннага таленту, Але многіх чытачоў цікавіць адказ на пытанне:

"А якім чалавекам быў Алесь Бурбіс?"

Янка Купала, успамінаючы аб першым знаёмстве з Алесем Бурбісам у 1904 годзе, прыгадваў:

“Усе былі гарачыя, […], шалёныя галовы, якія збіраліся цэлы свет перакуліць дагары нагамі. Вось сярод іх і быў Бурбіс, тады яшчэ малады, вясёлы, такі лёгкадаступны хлапчына. Кожную хвіліну можна было чакаць, што ўваліцца жандарская гання і пацягне ўсіх туды. Адкуль няма вяртання, ва ўсякім разе нялёгка вырвацца. Але для гэтых галоў страх не быў пісаны. І Бурбіс сыпаў сваімі вострымі слоўцамі як з рэшата. Ён любіў жарт, любіў пасмяяцца, хоць гэта і быў смех скрозь слёзы. ..І наперадзе ўсіх ішоў за свабоду і вызваленне беларускага сялянства Бурбіс…” [3, с.227].

А зараз дадзім. як кажуць, слова яго паплечніцы і аднадумцы па Беларускай сацыялістычнай Грамадзе Палуце Бадуновай, з якой Алесь Лаўрэнавіч пазнаёміўся у 1917 годзе ў Маскве, дзе меўся адбыцца з’езд Грамады:

“Гэты маленькі ростам чалавек з вялікай жывой душой рупліва ўзіраўся светлымі, поўнымі жыцця і розуму вачамі ў кожнага, хто называў сябе беларусам. Цвёрдым, громкім голасам, незвычайна моцным для яго маленькай фігуркі, ён проста ставіў пытанне:

-Ты хто? Мо, ты за грошы любіш свой народ? Можа толькі з карыснымі мэтамі падыходзіш да справы агульнай?

І гора таму. каго яму ўдавалася злавіць на месцы праступку. Няшчадна кляйміў ён яго самымі ганебнымі, самымі цяжкімі словамі:

Гэта злодзей! – грымеў ён. - Гэта той, хто, як Каін, забівае насмерць свайго брата-беларуса, аддаючы яго на загубу то маскалю, то паляку, то пану, то чыноўніку”[1. , с.16-17].

20 сакавіка 1922 года Алесь Бурбіс памёр ад сухотаў. Гэта здарылася ў атэлі “Парыж” у Мінску. Яго пахавалі на Старажоўскіх могілках.

У тыя дні газета “Савецкая Беларусь”, адным з рэдактараў якой ён быў адзін час Алесь Лаўрэнавіч, пісала:

“Беларусь! Пакрыйся сёння жалобай і йдзі на свежую магілу.. у якой без пары зляглі косці Твайго вернага – аж да скону, Твайго чыннага, аж да апошніх сіл, сына і змаганніка за Тваё адраджэнне – Алеся Бурбіса. Ідзі на магілу, каб там сказаць апошняе дзякуй і… плакаць. Плакаць над вялікай стратай, плакаць з жалю, што магіла вырывае ад Цябе, Беларусь. найлепшыя сілы. наймацнейшыя апоры…Усю сваю веру. надзеі і імкненні ахвяраваў Алесь Бурбіс справе Твайго, Беларусь, вызвалення. Усе свае сілы аддаў на службу Табе, І верным астаўся Табе аж да скону…Слёзы кахання, слёзы вялікай і вечнай падзякі хай сёння акропяць магілу Алеся Бурбіса, а з глыбіні сэрцаў нашых хай вырвецца; :Вечная памяць Яму!”

Анатоль Мяснікоў адзначаў, што Бог адвёў Алесю Бурбісу ўсяго только 37 гадоў жыцця. Дакладна, ён пражыў усяго 36 год, а яшчэ больш дакладна – роўна 36 гадоў і 5 месяцаў.

Спадзяюся, што памяць аб Алесе Бурбісе, які любіў і высока цаніў свій Народ, назаўсёды застанецца ў сэрцах нашай моладзі. усяго беларускага народа.

1.Мяснікоў А. Айчыны верныя сыны. Гістарычныя нарысы. /А.Мяснікоў//Мінск.Дзярж. прадпрыемства "Дом прэсы", 1997 – 95 с.

2.Біч М.В. Беларуская Сацыялістычная Грамада /М.В.Біч, С.С.Рудовіч //Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т.1. – Мн.: БелЭн, 1993 – 494 с.

3.Марціновіч А. Хто мы, адкуль мы…: Гіст. Эсэ. Нарысы. У 2 х кн. Кн.2 /А.Марціновіч //Мн.: Полымя. 1997 – 528 с.

4.Дзеяслоў. 20!0. № 5. С. 309-313.

5.Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі Т.1.Мінск, выд."Вышэйшая школа", 1975 – 336 с.

6. Купала Я. Збор твораў у 7 т. Т.7. /Я.Купала //Мн.: Выд-ва "Навука і тэхніка", 1976 – 696 с.

7. Біч М.В .Бурбіс Алесь./ М.В.Біч//"Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т.2. – Мн.: БелЭн., 1994 – 537 с.

8.Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф.15-п. Воп. 28. Спр.2.

Эмануіл Рыгоравіч Іофе, прафесар БДПУ імя М.Танка, доктар гістарычных навук.

220005. г.Мінск, пр.Незалежнасці. 39-90. Т.2-84-83-79 (х,)